# БЕЛАРУСКАЯ МОВА Ў ЭПОХУ ЛІЧБАВІЗАЦЫІ: ІНФАРМАЦЫЙНАЯ БЯСПЕКА І МОЎНАЯ ІНТЭГРАЦЫЯ

*Багушэвіч В.А., Змачынская У.А., Піліпейка С.М.*

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі*
*г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*

*Пятрова Н. Я. – к.філал.н., дацэнт*

У рабоце разглядаюцца пытанні, звязаныя з уплывам лічбавізацыі на выкарыстанне беларускай мовы ў сучасным грамадстве, вызначаецца яе роля ў забеспячэнні інфармацыйнай бяспекі. Звяртаецца ўвага на моўную палітыку ў сферы інфармацыйнай бяспекі, а таксама на сродкі аховы лінгвістычнай інфармацыі.

У сучасным свеце, які хутка развіваецца і становіцца ўсё больш аўтаматызаваным і лічбавым, атрымліваюць мноства розных новых магчымасцей і мовы, якія змяняюцца ў глабальнай інфармацыйнай прасторы. Беларуская мова, якая мае доўгую гісторыю і з’яўляецца важным элементам культурнай ідэнтычнасці беларусаў, таксама знаходзіцца ў эпіцэнтры гэтых навацый. Лічбавізацыя ўяўляе сабой адначасова інструмент для захавання і папулярызацыі беларускай мовы, але таксама і патэнцыйную пагрозу для яе аўтэнтычнасці і выжывання сярод іншых моў у свеце. Таму разуменне ролі беларускай мовы ў кантэксце лічбавізацыі, а таксама вызначэнне яе ўплыву на забеспячэнне інфармацыйнай бяспекі і моўнай інтэграцыі становіцца вельмі актуальным пытаннем у сучаснай лінгвістыцы.

Лічбавізацыя можа аказваць пазітыўны ўплыў на беларускую мову, прапануючы новыя магчымасці для яе распаўсюджвання і выкарыстання ў разнастайных сферах дзейнасці чалавека: ад адукацыі і культуры да бізнесу і ўрадавых паслуг. Аднак з’яўляюцца пытанні пра тое, як адаптаваць мову да новых тэхналагічных умоў без страты яе сутнасці і як абараніць яе ад магчымых негатыўных уздзеянняў лічбавізацыі. У гэтым кантэксце асаблівае значэнне набывае пытанне інфармацыйнай бяспекі. У эпоху, калі інфармацыя можа быць як зброяй, так і сродкам аховы, забеспячэнне бяспекі беларускай мовы ў лічбавай прасторы з’яўляецца крытычна важным момантам. Гэта ахоплівае не толькі ахову ад кібератак і інфармацыйнага ўмяшання, але і стратэгіі захавання і развіцця мовы ў лічбавым асяроддзі [1].

Як ужо было адзначана раней, лічбавізацыя ў XXI стагоддзі з’яўляецца неад’емнай часткай глабальных працэсаў, якія ахопліваюць усе аспекты чалавечага жыцця – ад прыватнай сферы да дзяржаўнага кіравання. Для беларускай мовы, як і для многіх іншых, гэта прадстаўляе як перашкоды, так і разнастайныя магчымасці. Разгледзім асноўныя аспекты гэтага ўплыву.

Па-першае, лічбавізацыя адкрывае новыя каналы для распаўсюджвання і выкарыстання беларускай мовы. Сацыяльныя медыя, блогі, анлайн-платформы для навучання, інтэрактыўныя выданні – усё гэта дазваляе мове дасягнуць развіцця і звароту да шырокай аўдыторыі. Разам з тым, такая магчымасць таксама патрабуе актыўных намаганняў па павышэнні якасці кантэнту і развіцці тэхналагічных рашэнняў на беларускай мове, каб забяспечыць яе прыцягальнасць і канкурэнтаздольнасць. Лічбавізацыя, несумненна, адкрывае новыя магчымасці для вывучэння і павышэння моўнай кампетэнцыі. Электронныя слоўнікі, анлайн-курсы, інтэрактыўныя праграмы і гульні на беларускай мове значна ўзмацняюць прэстыж беларускай мовы, выклікаюць цікаўнасць да яе і дапамагаюць паглыбіць веды пра яе. Аднак для гэтага неабходна стварэнне якасных беларускамоўных рэсурсаў, здольных зацікавіць як маладое пакаленне, так і дарослых [2].

З іншага боку, кіберпрастора вызначае і адмоўны уплыў на мову, звязаны ў першую чаргу з інфармацыйнымі атакамі, якія ў пэўнай ступені маніпулююць грамадскай думкай і могуць перашкаджаць у пытанні аховы моўных рэсурсаў. Таму развіццё і ўкараненне тэхналагічных рашэнняў для аховы беларускай мовы ў лічбавай прасторы становіцца крытычна важным. Гэта ўключае ў сабе стварэнне бяспечных беларускамоўных платформ для камунікацыі, развіццё сютэм аўтаматычнага распазнавання моў і машыннага перакладу на беларускую мову, а таксама падрыхтоўку спецыялістаў у галіне кібербяспекі, якія дасканала ведаюць беларускую мову [3].

Моўная палітыка ў сферы інфармацыйнай бяспекі і развіцці беларускай мовы ў эпоху лічбавізацыі абапіраецца на комплексны падыход, які ўключае заканадаўчае рэгуляванне, развіццё і падтрымку тэхналагічных рашэнняў, а таксама актывізацыю грамадскага ўдзелу. Ахова лінгвютычнай інфармацыі ў лічбавым асяроддзі ўяўляе сабой выклік, які патрабуе інавацый і супрацоўніцтва паміж дзяржавай, грамадскімі арганізацыямі і прыватным сектарам. Эфектыўная моўная палітыка пачынаецца з заканадаўчага рэгулявання, якое ахоўвае выкарыстанне беларускай мовы ў грамадстве і ў лічбавай прасторы. Гэта можа ўключаць прыняцце законаў і іншых заканадаўчых дакументаў, якія забяспечваюць прысутнасць беларускай мовы ў дзяржаўных інстытутах, сферы адукацыі, у СМІ і на разнастайных лічбавых платформах. Таксама важнае значэнне мае развіццё заканадаўства, якое ахоўвае мову ад дыскрымінацыі і забяспечвае яе роўны статус у грамадстве. У гэтым кірунку, на наш погляд, ключавую ролю адыгрываюць беларускамоўныя праекты і рэсурсы, накіраваныя на павышэнне нацыянальнай самасвядомасці, у якіх вядзецца гаворка пра гісторыю краіны, значэнне мовы, адбываецца папулярызацыя беларускай культуры і літаратуры і т. п.

На наш погляд, адной з ключавых праблем у галіне моўнай палітыкі і аховы лінгвістычнай інфармацыі з’яўляецца забеспячэнне пастаяннага пошуку фінансавых сродкаў для падтрымкі такіх моўных тэхналогій і

праектаў. Акрамя таго, мы лічым, што неабходна забяспечыць каардынацыю і супрацоўніцтва паміж рознымі зацікаўленымі бакамі: дзяржавай, грамадскімі арганізацыямі, навуковай супольнасцю і прыватным сектарам. Для аховы беларускай мовы ў лічбавай прасторы неабходны інвестыцыі ў развіццё моўных тэхналогій: аўтаматычны пераклад, сістэмы распазнавання моў, стварэнне моўных пакетаў для праграмнага забеспячэння і дадаткаў і інш. Гэтыя рашэнні будуць садзейнічаць пашырэнню доступу да лічбавых рэсурсаў на беларускай мове і спрыяць яе інтэграцыі ў паўсядзённае жыццё беларусаў [4].

Звернем увагу, што мова з’яўляецца ключавым элементам культурнай і нацыянальнай ідэнтычнасці кожнага народа, адыгрываючы вырашальную ролю ў фарміраванні самасвядомасці і самавызначэнні. Лінгвістычная ідэнтычнасць адлюстроўвае сукупнасць культурных, гістарычных і сацыяльных фактараў, якія злучаюць пэўную групу людзей праз агульную мову.

Мы лічым, што кожная мова з’яўляецца найпершай захавальніцай ведаў пра свет і жыццё свайго народа. Беларуская мова ўтрымлівае ў сабе ўнікальныя культурныя коды, традыцыі, гістарычныя рэферэнцыі і светапогляд, якія адлюстроўваюцца ў фальклоры, літаратуры, паэзіі і побыце. Захаванне і вывучэнне мовы дазваляе пакаленням перадаваць гэтыя каштоўнасці, забяспечваючы бесперапынную звязь з мінулым і аснову для будучыні [5].

Безумоўна, у эпоху глабалізацыі і лічбавізацыі беларуская мова сутыкаецца з выклікамі, звязанымі з дамінаваннем іншых сусветных моў у грамадстве і пашырэннем англамоўнага кантэнту ў інфармацыйнай прасторы. Таму, на нашу думку, у гэтым кантэксце ахова і развіццё беларускай мовы набывае стратэгічнае значэнне для захавання яе лінгвістычнай і культурнай унікальнасці. Мы лічым, што лічбавізацыя прадстаўляе эфектыўныя магчымасці для папулярызацыі нашай мовы, гэта датычыць найперш стварэння разнастайных электронных рэсурсаў, анлайн-курсаў і платформ для абмену інфармацыяй і навучання, што спрыяе ўмацаванню ідэнтычнасці сярод маладога пакалення.

Такім чынам, аналізуючы ўздзеянне лічбавізацыі на беларускую мову, становіцца зразумела, што месца беларускай мовы ў інфармацыйнай прасторы не самае спрыяльнае. Разам з тым, лічбавая эпоха прыносіць з сабой як перашкоды, так і магчымасці для развіцця беларускай мовы, якая мае багатую гісторыю і з’яўляецца носьбітам унікальнай культуры. Распаўсюджванне беларускай мовы ў лічбавай прасторы, забеспячэнне яе інфармацыйнай бяспекі, прыняцце заканадаўчых дакументаў і тэхналагічных рашэнняў, а таксама ўмацаванне лінгвістычнай ідэнтычнасці – усё гэта павінна абавязкова вызначаць моўную палітыку ў краіне і патрабуе сумесных намаганняў усіх зацікаўленых бакоў: дзяржавы, грамадскіх арганізацый, прыватнага сектара і кожнага грамадзяніна.

***Спіс выкарыстаных крыніц:***

*1. Проблемы национальных языков в условиях глобализации и интенсивного развития научно-технического прогресса [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://cyberleninka.ru/article/n/problemy-natsionalnyh-yazykov-v-usloviyah-globalizatsii-i-intensivnogo-razvitiya-nauchno-tehnicheskogo-progressa. – Дата доступа: 21.03.2024.*

*2. Лингвистическая наука и цифровая трансформация общества [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://lunn.ru/page/lingvisticheskaya-nauka-i-cifrovaya-transformaciya-obshchestva. – Дата доступа: 21.03.2024.*

*3. Русский язык в эпоху цифровой трансформации [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://cyberieninka.ru/articie/n/russkiy-yazyk-v-epohu-tsifrovoy-transformatsii. – Дата доступа: 21.03.2024.*

*4. Русский язык в эпоху цифровой трансформации [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://cyberieninka.ru/articie/n/russkiy-yazyk-v-epohu-tsifrovoy-transformatsii. – Дата доступа: 21.03.2024.*

*5. Белорусский язык в современном мире [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://word-house.ru/yazyki-perevoda/beiorusskiy-yazyk/roi-belorusskogo-yazyka-v-sovremennom-mire/ – Дата доступа: 05.04.2024.*